ДУК “Берастравіцкая раённая бібліятэка імя В.М. Кавалеўскага”
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# КРАЯЗНАЎЧЫ КАЛЯНДАР
# НА 2025 год

Вялікая Берастравіца, 2025 г

Краязнаўчы каляндар на 2025 год створаны на аснове кнігі "Памяць" Бераставіцкага раёна, "Летапіснай хронікі Бераставіччыны", тэматычнай папкі "Знакамітыя людзі Бераставіччыны", фактаграфічнай картатэкі "Славутыя імёны Бераставіччыны". Папка і картатэка змяшчаюць звесткі энцыклапедычных выданняў: Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Мінск: БелЭн., 1996-2003. - Т. 1 -16; Беларусь: Энцыкл. давед. - Мінск: БелЭн., 1995; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск: БелЭн., 1993-2001. - Т. 1-6; Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X-XIX стст.: Энцыкл. давед. - Мінск: Бел.Эн., 1995; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. - Мінск: БелСЭ, 1984-1987; Беларускія пісьменнікі: Бібліягр. слоўн.: У 6 т. - Мінск: БелЭн., 1992-1995; Пяткевіч, А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / Аляксей Пяткевіч. - Гродна, 2000; Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы: біябібляўгр. давед. – Гродна, 1999; Заведующие кафедрами и профессора Гродненского государственного медицинского (института) университета (1958-2003). – Гродно, 2003; Книга героев Гродненской области. – Гродно, 2005; Культура Гродзеншчыны: Факты. Падзеі. Асобы. – Мінск, 2014; Ермоленко, В.А. 400 имён: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины / В.А. Ермоленко, В.Н. Черепица.- Гродно, 2014; Гостев, А.П. Известные уроженцы Гродненской области / А.П. Гостев. – Гродно, 2016.

Адбор юбілейных дат рабіўся ў адпаведнасці са значнасцю для гісторыі, эканомікі і культуры краю. Для персаналій юбілейнымі выраашана лічыць: 10, 20, 30, 40, 50, 60, 65, 70 ... і далей гадоў. Указваюцца сувязі дзеячаў з Бераставічынай. Даты даюцца па новаму стылю, геаграфічныя аб'екты – згодна сучаснаму адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму дзяленню.

Спадзяёмся, што наш каляндар будзе карысным і цікавым для шырокага кола чытачоў, краязнаўцаў, бібліятэкараў і для ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.



**550** гадоў з дня нараджэння ***Хадкевіча Аляксандра Іванавіча*** (1475-1549), дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, ваяводы Навагародскага, маршалка гаспадарскага, мецэната, першага ўладальніка Бераставіцы ў 1506 – 1549 гг.



**525** гадоў з дня нараджэння ***Хадкевіча Рыгора Аляксандравіча*** (каля 1500 – 12.11.1572), гетмана Вялікага княства Літоўскага, удзельніка Інфлянцкай вайны з Масковіяй (1564-1583), другога сына ваяводы Навагародскага А.І.Хадкевіча. Уладальнік Бераставіцы ў 1550 – 1569 гг.



**475** гадоў з часу стварэння акта падзелу радавых уладанняў А.І. Хадкевіча (1550 г.), ваяводы навагародскага, уладальніка Бераставіцы ў 1506 – 1549 гг., паміж яго сынамі Рыгорам, Геранімам і Юрыем. Бераставіца перайшла ва ўласнасць Юрыя і Рыгора . А з 1570 г. яе уладальнікамі сталі дзеці Юрыя Хадкевіча (к. 1509-1569), ад якога бярэ пачатак бераставіцкая лінія Хадкевічаў.



**460** гадоў з дня нараджэння ***Хадкевіча Гераніма Юр'евіча*** (1565 – 1617), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Вялікага княства Літоўскага, кашталяна віленскага, старасты брэст-літоўскага, уладальніка Бераставіцы ў 1595 – 1617 гг., фундатара касцёла Звеставання Панны Марыі ў 1615 г.



**455** гадоў з часу першага ўпамінання маётка Вялікія Эйсманты, якім валодалі баяры Эйсманты герба Кораб у Волпаўскай воласці. У 1570 г. кароль польскі Зыгмунт II Аўгуст зацвердзіў сваім Прывілеем продаж маёмасці Амброзія Пятровіча Эйсманта *“у павеце Гродзенскім лежачае”.*



**435** гадоў з дня нараджэння ***Хадкевіча Крыштофа*** (каля 1590-1652), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, кашталяна трокскага (1633—1636 гг.), віленскага (1636—1642 гг.), ваяводы віленскага з 1642 г., старасты гродзенскага, бабруйскага, крэўскага, уладальніка Вялікай Бераставіцы ў 1617 -1652 гг. Пры Крыштофе ў мястэчку з’яўляецца драўляны палац Хадкевічаў.



**430** гадоў з дня смерці ***Хадкевіча Ежы Юр’евіча*** (? – 26.10.1595, Бераставіца), дзяржаўнага дзеяча Вялікага княства Літоўскага, маршалка Трыбунала Літоўскага, старасты жмудскага, уладальніка Бераставіцы да 1595 г., пахаванага ў склепе касцёла Звеставання Панны Марыі ў Бераставіцы.



**410** гадоў з часу асвячэння (1615) касцёла Звеставання Панны Марыі ў Вялікай Бераставіцы, помніка архітэктуры барока, першым фундатарам якога быў Геранім Хадкевіч (1565 – 1617), кашталян віленскі і староста брэст-літоўскі, уладальнік Вялікай Бераставіцы ў 1595-1617 гг. Касцёл у 1615 г. быў пабудаваны з дрэва і асвячоны віленскім біскупам Бенедыктам Войнам (?-1615).



**395** гадоў з дня нараджэння ***Мнішка Ежы Яна Вандаліна*** (каля 1630-1693), дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай, кашталяна санацкага (з 1678 г.), ваяводы валынскага (1684-1692), уладальніка Вялікай Бераставіцы ў 1661-1693 гг., фундатара будаўніцтва драўлянага касцёла ў Рудаве – месце культу абраза Божай Маці Рудавай.





**355** гадоў з дня нараджэння ***Мнішка Юзафа Вандаліна*** (1670-1747), дзяржаўнага дзеяча і буйнейшага магната Рэчы Паспалітай, маршалка вялікага кароннага, кашталяна кракаўскага, мецэната, уладальніка Вялікай Бераставіцы ў 1700-1747 гг., які ахвяраваў грошы на будаўніцтва ў Бераставіцы новага мураванага касцёла замест згарэлага ў 1741 г. драўлянага.



**315** гадоў з дня нараджэння ***Клема Яна Генрыха*** (каля 1710-1777), нямецкага архітэктара эпохі барока, які працаваў у Рэчы Паспалітай, аўтара праекта ратушы з гандлёвымі радамі ў Вялікай Бераставіцы ў 1754-1755 гг.



**310** гадоў з дня нараджэння ***Мнішка Ежы Аўгуста Вандаліна*** (1715-1778), дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай, маршалка надворнага кароннага і кашталяна кракаўскага, уладальніка Вялікай Бераставіцы ў 1747-1774 гг. і ініцыятара надання Вялікай Бераставіцы Магдэбургскага права ў 1754 г.




**300** гадоў з часу надання Бераставіцы статуса мястэчка (горада) (1725 г.) каралём Рэчы Паспалітай Аўгустам II Моцным (1670-1733).



**280** гадоў з дня нараджэння Францішка Смуглевіча(1745-1807), мастака-педагога беларускага класіцызма, прафесар жывапісу і малюнка Віленскага ўніверсітэта (1797-1807). Працаваў ва ўсіх жанрах жывапісу. У 1798-1800-х гг. стварыў абраз анёлаў-ахоўнікаў для касцёла Звеставання Панны Марыі ў Вялікай Бераставіцы.



**275** гадоў назад (1750 г.) граф Тадэуш Дунін-Юндзіл (каля 1720 – 1771) пачаў будаўніцтва палаца ў Мураванай Бераставіцы. Будаўніцтва завяршыў яго сын Францішак Дунін-Юндзіл, падкаморы гродзенскі, маршалак шляхты Гродзенскага павета.



**275** гадоў назад (каля 1750 г.) была пабудавана капліца на каталіцкіх могілках у Вялікай Бераставіцы, помнік драўлянай архітэктуры, выкананы ў стылі ўсходняга шатровага дойлідства. Помнік існаваў да 1978 г. Не захаваўся.



**245** гадоў з дня нараджэння ***Анацэвіча Ігната Сымонавіча*** (1780, в. Малая Бераставіца – 18.02.1845, Пецярбург), прафесара Віленкага універсітэта, вядомага гісторыка, археографа, архівіста, магістра філасофіі, выдаўцы і педагога.



**240** гадоў з дня нараджэння ***Бароўскага Каспара герба Ястрабец*** (1785, Гродзеншчына - 1854, Беласток), беларускага мастака і графіка, настаўніка малявання ў Коўна, гімназіях Мінска і Беластока. У 1835 г. выканаў рэлігійныя карціны для касцёла Св. Яна Непамука і Панны Марыі ў Вялікіх Эйсмантах.



**240** гадоў з дня нараджэння ***Ельскага Людвіка*** (1785, в. Масаляны – 08.08.1843), дзяржаўнага дзеяча Каралеўства Польскага, прэзідэнта Польскага банка (1828), намесніка міністра скарбу ў час паўстання 1830-1831 гг.



**230** гадоў з дня нараджэння ***Касакоўскага Станіслава*** (1795-1872), польскага дыпламата на расийскай службе, сенатара, тайнага радцы, літаратара, егіптолага-аматара, калекцыянера і мастака, уладальніка Вялікай Бераставіцы ў 1840 – 1872 гг., фундатара будаўніцтва царквы Святога Мікалая ў Вялікай Бераставіцы (1868).



**230** гадоў з часу асвячэння (1795 г.) Крыжаўзвіжанскага касцёла ў вёсцы Макараўцы, які быў пабудаваны з дрэва на сродкі Людвіка і Канстанцыі Панцежынскіх, уладальнікаў сядзібы Уснар Драўляны. Крыжаўзвіжанскі касцёл – помнік архітэктуры ранняга класіцызму.





**225** гадоў з дня нараджэння ***Кавалеўскага Восіпа Міхайлавіча*** (28.12.1800, Вялікая Бераставіца – 1878, Варшава), вядомага польскага і расійскага гісторыка, філолага-усходазнаўца, заснавальніка навуковага манголазнаўства, перакладчыка, прафесара Пецярбургскай Акадэміі Навук.



**225** гадоў назад (1800 г.) Ю.Д. Касакоўскі (1771 – 1840), вялікі лоўчы ВКЛ, ўладальнік мястэчка ў 1793 -1840 гг., пачаў будаўніцтва радавой рэзідэнцыі – першага мураванага палаца ў Вялікай Бераставіцы. Аднапавярховы палац у класічным стылі быў завершаны ў 1810-х гг. (не захаваўся).



**175** гадоў з часу асвячэння (1850 г.) касцёла ў імя Марыі і Св. Яна Непамука ў Вялікіх Эйсмантах. Пасля чарговага пажару касцёл быў адноўлены ў камені ксяндзом Міхалам Сезянеўскім ў 1843 – 1850 гг. і з’яўляецца помнікам архітэктуры неакласічнага стылю.



**175** гадоў з пачатку будаўніцтва (1850 г.) касцёла Св. Антонія ў Малой Бераставіцы па праекту гродзенскага інжынера Нардштэйна (1851), які выправіў першапачатковы план будаўніцтва касцёла гродзенскага каморніка Малевіча (1850). Фундатарам будаўніцтва стаў Антон Ваўкавіцкі, прадвадзіцель дваранства Сакольскага павета, уладальнік маёнтка ў Малой Бераставіцы. Будаўніцтва завершана ў 1859 г. Касцёл дзейнічае.



**165** гадоў назад (1860 г.) завершана будаўніцтва неагатычнай капліцы ў Масалянах. Фундатаркай будаўніцтва стала Юзэфа Вайчынская з Біспінгаў (1786 – 1878), камер-юнкерша імператарскага двара, ўладальніца маёнтка ў Масалянах. Праект стварыў у 1856 г. варшаўскі архітэктар А. Градзецкі. Капліца дзейнічае.



**165** гадоў назад (1860 г.) пачата будаўніцтва мураванай царквы Святога Мікалая Цудатворцы ў Вялікай Бераставіцы па праекту архітэктара Я. Фардона (1854 г.). Будаўніцтва фундаваў граф Станіслаў Шчэнсны Касакоўскі (1795-1872), уладальнік Бераставіцы. Царква асвечана ў кастрычніку 1868 г. і з’яўляецца помнікам архітэктуры рэтраспектыўнага рускага стылю.

**155** гадоў назад (пач. 1870-х гг.) у краі паявіліся першыя фельчары, якія аказвалі медыцынскую дапамогу насельніцтву і былі ў яго на службе па вольным найме: паміж сялянамі воласці або некалькіх вёсак і медыцынскімі фельчарамі заключаўся дагавор, у якім прадугледжваліся ўмовы і памеры аплаты фельчара грашыма і натурай, а таксама яго абавязкі перад насельніцтвам.



**150** гадоў з дня нараджэння ***Вальнцэвіча Паўла Канстанцінавіча*** (1875, Вялікая Бераставіца – 1962, г. Ваўкавыск), святара беларускай праваслаўнай царквы, пратаіерэя Свята-Мікалаеўскай царквы ў в. Узмёны (Міёрскі р-н, Віцебская вобл.), фатографа-аматара, які адлюстраваў на фотаздымках летапіс беларускіх вёсак 1 пал. 20 ст. У 1908-1911 гг. здымаў на фота архітэктуру і кірмашы Вялікай Бераставіцы.



**150** гадоў з дня нараджэння ***Ельскага Лявона*** (1875-?), першага доктара ў Вялікай Бераставіцы, які працаваў з 1924 па 1931 гг. і на вул. Гарадзенскай трымаў аптэку.



**130** гадоў з дня нараджэння ***Кавалені Аляксандра Дзмітрыевіча*** (1895, в. Кашанцы – 27.08.1937), беларускага археолага, навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі АН Беларусі (1932-37). Даследаваў стаянкі палеаліту (Бердыж, Юравічы), гарадзішчы ў Тураве, працаваў над археалагічнай картай Беларусі. На падставе неабгрунтаваных абвінавачванняў рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1958 г.



**125** гадоў з пачатку будаўніцтва (1900 г.) палаца Касакоўскіх “Новы замак” у Вялікай Бераставіцы па праекту польскага архітэктара Юліуша Васюцінскага ў стылі эпохі Рэнесанс. “Новы замак” - помнік архітэктуры канца XIX – пачатку XX стагоддзяў, быў пабудаваны ў 1901 г., не захаваўся (разабраны ў канцы 40-х гг. XX ст.)



**120** гадоў назад памёр ***Касакоўскі Станіслаў Казімір*** (1837-1905), дзяржаўны і грамадскі дзеяч Каралеўства Польскага, вядомы гісторык і генеалог, піянер фатаграфіі ў Польшчы, уладальнік маёнтка ў Вялікай Бераставіцы з 1872 па 1905 гг.



**115** гадоў з дня нараджэння ***Адляніцкага-Пачобута Міхаіла Ігнацьевіча*** (31.03.1910, в. Пачобуты - 2004), вядомага вучонага, доктара геадэзіі, прафесара, правадзейнага члена Польскай Акадэміі Навук, ганаровага старшыні Камітэта геадэзіі ПАН.



**110** гадоў назад (верасень 1915г.) Бераставіччына была акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі падчас Першай Сусветнай вайны. Акупацыя прадаўжалася да 1919 г.



**105** гадоў з дня нараджэння ***Варанецкага Андрэя Максімавіча*** (19.02.1920, в. Дубраўка Пухавіцкага раёна Мінскай вобл. – 14.01.1972), Героя Сацыялістычнай Працы (1966 г.), старшыні праўлення калгаса “Гвардыя” в. Вялікія Эйсманты Бераставіцкага раёна ў 1953-1972 гг. (з 1972 – калгаса імя Варанецкага).



**105** гадоў з дня нараджэння ***Соламавай Вольгі Іосіфаўны*** (29.05.1920 г., в. Лаша, Гродзенскі павет, Беластоцкага ваяводства. — 02.02.1944 г. вёска Жорнаўка, Бераставіцккі раён, Гродзенская вобласць, Беларусь). Арганізатар партызанскага падполля ў Беластоцкай вобласці падчас Вялікай Айчыннай вайны. У гады вайны — сакратар Гродзенскага падпольнага Камітэта камсамола. Стварала падпольныя камсамольскія групы, трымала сувязь з партызанамі, вяла працу сярод насельніцтва Бераставіцкага раёна. Загінула ў в. Жорнаўка Бераставіцкага раёна.



**105** гадоў з дня нараджэння ***Шышкіна Мікалая Васільевіча*** (1920-2004), ветэрана ВАВ 1941-45 гг.,былы камандзір 1-й роты партызанскага атрада “Звязда”, з 1944 г — сакратар Бераставіцкага падпольнага райкома камсамола, вёў “рэйкавую вайну” на чыгунцы Гродна-Кузніца-Беласток. Адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.



**95** гадоў з дня нараджэння ***Бароўскага Міхаіла Іванавіча*** (1930, в. Плюскалаўцы - 2001), доктара філасофскіх навук (1985), прафесара Беларускага інстытута фізічнай культуры (1989).



**90** гадоў з дня нараджэння ***Леткі Івана Антонавіча*** (14.06.1935, маёнт. Масаляны – 23.08.1999, Масква), беларускага паэта і пісьменніка, сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1978 г.). Аўтар зборнікаў паэзіі “Тры крокі ад сонца”(1967), “Тры верасні”(1970), “Грамы на зімоўцы”(1974), “Агні над пралётамі”(1991), паэмы “Каліноўцы”(1973) і інш.



**90** гадоў з дня нараджэння ***Машко Івана Рыгоравіча*** (н. У 1935 г., в. Сыраежкі), дэпутата Вярхоўнага Савета БССР 9, 12, 13-га скліканняў, дэлегата XXVI – XXVIII з’ездаў КПСС і XIX Усесаюзнай партканферэнцыі, у 1990-1996 гг. – намесніка старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў.



**85** гадоў з дня нараджэння ***Заламая Уладзіміра Аляксандравіча*** (н.07.01.1940, в. Канчаны), дзяржаўнага дзеяча Беларусі, 1990-1994 гг. – намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР, дзяржаўнага сакратара па справах СНГ, з 1994 г. – старшыні Брэсцкага аблвыканкама, народнага дэпутата СССР (1983-1992), з 1996г. – члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, з 2000г. - кіраўніка аддзялення пасольства

Рэспублікі Беларусь у Расіі ў Калінінградзе, з 2008 г. – генеральнага дырэктара ААА “Балтыйская гандлёвая кампанія”.



**85** гадоў з дня нараджэння ***Мароза Аркадзія Іосіфавіча*** (н. у 1940 г., в. Траццякі), навукоўца, кандыдата эканамічных навук (1978 г.), дацэнта (1973 г.), члена-карэспандэнта Беларускай інжынернай акадэміі (1996 г.).

**85** гадоў назад (1940 – 1941 гг.) у раёне пачала фарміравацца сістэма медыцынскіх устаноў, якая аб’ядноўвала 3 бальніцы (Крынкаўская, Вялікабераставіцкая, Масалянская (Алекшыцкая), паліклініку, 4 амбулаторыі і фельчарска-акушэрскія пункты. У 1940 г. яе ўзначальваў К. Кажушка.

**85** гадоў назад (1940 – 1941) у Вялікай Бераставіцы пачаў дзейнічаць масласырзавод, які ў Вялікую Айчынную вайну быў разбураны фашыстамі, адноўлены ў 1945 г.

**85** гадоў назад (красавік 1940 г.) была створана Бераставіцкая МТС (дырэктар Цітовіч), дзейнасць якой спыніла Вялікая Айчынная вайна. Адноўлена ў 1945 г.

**85** гадоў назад (1940 г.) у раёне пачала фарміравацца сістэма паштовай сувязі, якая аб’ядноўвала 6 паштовых аддзяленняў і якую ўзначаліў Карольчык.

**85** гадоў назад (люты – сакавік 1940 г.) у вёсках Гольні, Масаляны, Ярмолічы, Кудрычы і іншых створаны першыя на Бераставіччыне калгасы.



**85** гадоў назад (студзень – красавік 1940 г.) створана гандлёвая арганізацыя (райсаюз) на чале з Жызнеўскім. Пасля вайны пачала працаваць з 18 жніўня 1944 г.

**80** гадоў назад (1945 г.) для аховы лясоў на тэрыторыі раёна створана лясніцтва. Першы ляснічы – М. Г. Кананчук.

**80** гадоў назад (студзень – ліпень 1945 г.) у раёне арганізаваны калгасы “Перамога” (в. Стары Дворац) і “Кастрычніцкая рэвалюцыя” (в. Людвінова), а таксама адноўлены калгас “1-е Мая” (в. Вайцехаўшчына).

**80** гадоў назад (1945 г.) створана раённае нарыхтоўчае каапературна-прамысловае прадпрыемства па закупу прадуктаў, бульбы і агародніны ў насельніцтва. Першы дырэктар – В.А. Палуян.

**80** гадоў назад (восень 1945 г.) пачала дзейнічаць санэпідэмслужба раёна, якую ўзначаліла К.А. Мацапура.



**75** гадоў з дня нараджэння ***Кругліка Уладзімірва Міхайлавіча*** (1950, в. Пархімаўцы – 03.04. 2014), савецкага і расійскага военачальніка, з 1983 г. – памочніка начальніка Палітупраўлення пагранічных войскаў КДБ СССР па камсамольскай рабоце, з 1992 – начальніка Упраўлення выхаваўчай работы Федэральнай пагранічнай службы Расіі, намесніка дырэктара Федэральнай пагранічнай службы Расіі (1998 – 2003), генерала-палкоўніка (1999) ў адстаўцы.



**75** гадоў з дня нараджэння ***Коханава Анатолія Паўлавіча*** (23.02.1950 г., в. Замакроўе Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. – 21.01.2017), заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, з 1979 па 2012 гг. старшыні СВК “Малаберастаўіцкі элітгас”, з 2012 г. – дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальга Сходу Рэспублікі Беларусь па Мастоўскай выбарчай акрузе №56. Узнагароджаны орэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам Пашаны, медалём “Каложскі крыж III ст.” (2016).



**70** гадоў з дня нараджэння ***Балюк Галіны Канстанцінаўны*** (21.05.1955 г. у в. Агароднікі Свіслацкага раёна). З 1997 г. галоўны ветурач раёна, начальнік Бераставіцкай раённай ветстанцыі. Пад кіраўніцтвам Балюк Г. К. раённай ветстанцыя ўзнагароджана Ганаровым дыпломам Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання РБ у 2007 годзе. Ганаровы грамадзянін

Бераставіцкага раёна (2024). Званне прысвоена за высокія дасягненні і значны асабісты ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны Бераставіцкага раёна.



**70** гадоў з дня нараджэння ***Эйсмант Тамары Іванаўны*** (1955 г у в. Малая Бераставіца Бераставіцкага раёна). Настаўнік, Ганаровы грамадзянін Бераставіцкага раёна (2017). У 2011 годзе прысвоена ганаровае званне “Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь”. У 2013 г. – лаўрэат прэміі Гродзенскага аблвыканкама “Чалавек года Гродзеншчыны”. Узнагароджана Граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь., Гродзенскага аблвыканкама і Бераставіцкага райвыканкама. У 2017-2020 гг працавала захавальнікам музейных фондаў народнага гісторыка-краязнаўчага музея “Вытокі”.



**65** гадоў з дня нараджэння ***Скрундзеўскай Яніны Янаўны*** (1960 г. у г. п. Радунь Воранаўскага раёна). Намеснік галоўнага ўрача Бераставіцкай ЦРБ. Ганаровы грамадзянін Бераставіцкага раёна. Званне прысвоена за асаблівыя заслугі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Бераставіцкага раёна. У 2021 г. прысвоена ганаровае званне “Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь”. Узнагароджана Ганаровымі граматамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага аблвыканкама і Бераставіцкага райвыканкама.

Краязнаўчы каляндар
Берастаўчычыны на 2025 год

Складальнік І. У. Антановіч

Дызайн вокладкі А.Ф. Втарушын

Адказны за выпуск С. В. Станкевіч

Падпісана да друку 15.11.2024 года

Тыраж 20 экз.

Выдавецтва Бераставіцкай раённай бібліятэкі імя В.М. Кавалеўскага

231778 Вялікая Бераставіца, вул. Чырвонаармейская, 4